

# СЕЛЯДЗЕЦ ПАД ФУТРАМ

Днямі нам з мужам па пошце прыйшлі сланечнікі. І не адкуль-небудзь, а з Парыжа. Нашага, беларускага. Калі хто яшчэ не ведае, ёсць вёсачка з такой назвай на Віцебшчыне.

Справа ў тым, што нашы сябры сёлета вырашылі не ехаць за мяжу, а правесці свой адпачынак у вандроўках па Беларусі. Наведалі ўжо Бычкі Быкава,Ушачы Барадуліна, паплавалі ў Браслаўскіх азёрах, падыхалі чыстым паветрам балота Ельня. І, як вы ўжо зразумелі, дабраліся нават да Парыжа. Відаць, ім там было так добра, што вырашылі падзяліцца сваім шчасцем з кімсьці яшчэ. Зайшлі на пошту, купілі беларускамоўную паштовачку з сонечнымі сланечнікамі і даслалі нам «прывітанне з нашага беларускага Парыжа». Ад такога клопату ў мяне на душы стала сонечна.

Тая парыжская паштоўка нагадала мне іншую гісторыю — пра керамічную масленіцу, размаляваную сланечнікамі. У адзін цудоўны вечар муж вярнуўся ад бацькоў з Віцебска. Я была ў пакоі, калі ён пачаў распакоўваць сумкі. «Ну я ж прасіў...», — пачула я абураны голас з кухні. Аказваецца, Вова прасіў маці не класці масленіцу, бо маем ужо адну. І другая нам не патрэбна. Але яна, відаць, усё адно паклала. «І так паўтараецца кожны раз. Я ўжо не ведаю, што рабіць. Мая маці мяне не чуе. Адчуваю сябе «згвалтаваным» яе клопатам». У той вечар муж расказаў мне, як аднойчы ён ледзь дацягнуў дадому скрыню з буракамі, якія маці даслала па пошце, бо пераживала, што сыну няма чаго есці. «А аднойчы перад маім ад'ездам у Мінск яна запыталася: «Табе ж пакласці селядзец пад футрам?» Я, вядома, адказаў «не», бо я яго не ем. І расслабіўся. А дарэмна. Дарэмна не праверыў, не пракантраляваў, бо адгадай, што чакала мяне дома ў пакеце пад кантэйнерам з піражкамі? Правільна, ЁН самы!»

Нашы з мужам мамы вельмі падобныя. Абедзве гатовыя аддаць дзецям апошняе. Раней я рэагавала на такі клопат прыблізна так, як і Вова. Раздражнялася, калі мама перадавала мне такую колькасць закрутак, якую з'есці адной ну проста нерэальна. Злавалася, калі яна штовечар пыталася: «А што ты сёння ела?» Ці прасіла: «Апранайся цяплей», «Патэлефануй, як дабярэшся дадому». Але дзякуючы мужу паглядзела на сябе збоку. І памяняла тактыку.

Зразумела, што матуль мы не ў сілах змяніць. А вось сваю рэакцыю на такое праяўленне любові можам. Замест таго каб раздражняцца і крыўдзіць іх сваім незадаволеным «ну я ж прасіў(-ла)», лепш проста з удзячнасцю прыняць клопат. Парадавацца, што як мінімум двум людзям на свеце важна ведаць ва ўсіх падрабязнасцях, ШТО мы сёння елі.

Ды і селядзец пад футрам не варты таго, каб крыўдзіцца на маму. Тым больш сярод вашых знаёмых дакладна знойдуцца людзі, якія абажаюць гэтую салату. Можна запрасіць сяброў у госці і пачаставаць іх мамінымі фірмовымі агурчыкамі, што я перыядычна і раблю. І потым прапанаваць камусьці з іх прыгожую масленіцу са сланечнікамі.

Я, дарэчы, так і зрабіла. Масленіцу, якая так узрушыла мужа, аддала калякжанцы. Яна вельмі абрадавалася такому падарунку. Больш за тое, на наступны дзень забегла да мяне ў кабінет з мабільным тэлефонам, каб паказаць фотаздымак. «Уяўляеш, учора дома на антрэсолях знайшла заварнік ды абрус з такімі ж сонечнымі сланечнікамі, як і на тваёй масленіцы». Убачыла я гэты сланечнікавы нацюрморт, і на душы зноў стала сонечна.

«Вечна тваім застанецца толькі тое, што ты аддаў». Уладзімір Караткевіч, відаць, адчуваў прыблізна тое ж самае, калі пісаў гэтыя радкі.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*


# Сямейная газета

**Выпуск №17 (84)**


■ Тыя, хто побач

# РАЙ НА ЗЯМЛІ

## ЧАМУ ГАРАДЖАНЕ ВЫРАШЫЛІ ПАДАРЫЦЬ СВАІМ СЫНАМ ВЯСКОВАЕ ДЗЯЦІНСТВА?



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Больш як 8 гадоў таму Мікіта Цэхановіч прыгледзеў на ўскрайку маляўнічай вёскі драўляную хатку. Купіў яе ўсяго за 300 долараў. І пераехаў жыць з Баранавіч у Горную Руту. «Я пачаў шукаць свой рай на зямлі яшчэ да знаёмства з Наташай. Памятаю, саджаў вось гэтыя кусцікі з думкамі, што мае дзеці зранку басанож будуць з дому выбягаць ды сваімі маленькімі пальчыкамі ягадкі рваць. Цяпер усё так і адбываецца».**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ Гэта па-нашаму!

# «НЕ ЗНАЙШЛІ — ЗРАБІЛІ САМІ»

## Як Адэлька натхніла тату і бабулю на стварэнне 3D-канструктара Мірскага замка

**Зусім нядаўна ўнікальны экалагічны канструктар з'явіўся на паліцах беларускіх крамаў. Зроблена цацка з трывалага кардону. Сабраць яе можна з дапамогай інструкцыі прыблізна за дзве гадзіны. Без клею і нажніц. У камплекце, акрамя дэталяў замка, яшчэ і чатыры фігуркі гістарычных асоб таго часу.**

— Я выбірала ўсіх чалавечкаў, — кажа пры сустрэчы васьмігадовая Адэля Бахун. — Вось гэта Бронны баярын, побач Камандыр, Панна ды Крылаты гусар. З імі дзеткі могуць гуляць у двары кардоннага замка *(паказвае)*.

— Адэлька вельмі любіць персанажаў розных гістарычных эпох, — удакладняе Сяргей Бахун, тата Адэлі, — таму мы ёй пастаянна купляем разнастайныя фігуркі з іх вывамі. У дачушкі гэтых чалавечкаў ажно тры скрыні. Яна ўсіх іх ведае.

— А яшчэ я люблю збіраць розныя канструктары, пазлы.

— Прынамсі, з гэтага яе захаплення ўсё і пачалося. Аднойчы Адэлька папрасіла пазл з якім-небудзь беларускім замкам. Абышлі ўсе дзіцячыя крамы. Там бачылі ўсё што можна — Эйфелеву вежу, Крэмль, Статую Свабоды. Але так і не знайшлі ніводнага канструктара, прысвечанага нашай гісторыі. На выхадныя паехалі з Адэлькай у Брэст праведаць бабулю. Расказалі ёй за гарбаткай пра сваё гора. А яна і кажа: «Не знайшлі, дык давайце зробім самі». Тым больш досвед у нас ужо быў: некалькі гадоў таму мы распачалі невялічкую сямейную справу (Тамара Бахун пасля выхаду на пенсію пры дапамозе сына пачала выпускаць крэатыўныя паштоўкі на беларускай мове. — **Аўт.**) Рабілі канструктар у першую чаргу для дзетак, таму ва ўсім раіліся з Адэлькай.

***— У Беларусі столькі выдатных гістарычных будынкаў. Чаму спынілі выбар менавіта на Мірскім замку?***

— Мы апыталі знаёмых. Аказалася, што гэта самая пазнавальная беларуская архітэктурная каштоўнасць. Перад тым як рабіць канструктар, паехалі ў Мір і папрасілі дазволу на выкарыстанне копіі замка. Там нашай ідэі вельмі ўзрадаваліся. І нават прапанавалі заключыць дагавор, каб мець магчымасць прадаваць нашы пазлы ў сваёй сувенірнай лаўцы. Разам з тым, на жаль, далёка не кожны беларус быў у Міры. А вось складуць дома мадэль замка і, спадзяюся, захочуць убачыць яго ў рэальнасці. Збяруцца ў выхадны дзень і паедуць у Мір усёй сям'ёй. Праблема ж у тым, што дзеці цяпер сядзяць у сваіх камп'ютарах, бацькі — у сваіх. Гэта шкодзіць сямейным стасункам... Сёлета я ўпершыню завёз Адэльку ў Мірскі замак. Першае, што яна сказала: «Ух ты! Ён такі вялікі!»



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*